# СКАЗЫ З АДАСОБЛЕНЫМІ ЧЛЕНАМІ (ПАДАГУЛЬНЯЛЬНЫ ЎРОК)

# ПРАЧЫТАЙЦЕ НЕКАЛЬКІ ЎРЫЎКАЎ З ТВОРАЎ ПРА ВЯЛІКУЮ АЙЧЫННУЮ ВАЙНУ.

- **І падаў, распасцёрты,**
  **Кожны чацвёрты.**

  *Анатоль Вярцінскі*

- **Браты мае – байцы і камандзіры –**
  **Праз тоўшчу год я чую вашу кроў.**

  *Сяргей Грахоўскі*

- **У тую ж ноч з барака збеглі двое,**
  **Парвалі агароджу ля варот**
  **І асцярожна вынеслі з сабою**
  **Франтавіка-таварыша за дрот.**

  *Мікола Аўрамчык*

- **Калі сябры прыселі на траве,**
  **Дваім здавалася, што зараз трэці,**
  **Адчуўшы волю, раптам ажыве.**

  *Мікола Аўрамчык*

- **Калі сябры прыселі на траве,**
  **Дваім здавалася, што зараз трэці,**
  **Адчуўшы волю, раптам ажыве.**

  *Мікола Аўрамчык*

- **За край мой, заліты нявіннай крывёй,**
  **Праклянцце чужынцам ліхім.**

  *Аляксей Коршак*

- **З агульнай колькасці 9200 беларускіх сёл і вёсак, разбураных і спаленых гітлераўцамі за гады Вялікай Айчыннай вайны, 4885 было знішчана карнікамі. Поўнасцю, з усімі жыхарамі, было знішчана 627.**

*А.Адамовіч, Я.Брыль, У.Калеснік*

- **Былі яны проста дзяўчатамі,**

**Што там ні гавары.**

**Пужаліся свісту міны,**

**Чужых незычлівых вачэй,**

**А гінулі – як мужчыны,**

**Абняўшы зямлю ямчэй.**

*Еўдакія Лось*

- Знайдзіце сказы з адасобленымі ***<u>азначэннямі (1,2 групы).</u>***
- Знайдзіце сказы з адасобленымі ***<u>прыдаткамі (3,4 групы).</u>***

- **І падаў, *распасцёрты,***

  **Кожны чацвёрты.**

  *Анатоль Вярцінскі*

- **Браты мае *– байцы і камандзіры* –**

  **Праз тоўшчу год я чую вашу кроў.**

  *Сяргей Грахоўскі*

- **У тую ж ноч з барака збеглі двое,**
  **Парвалі агароджу ля варот**
  **І асцярожна вынеслі з сабою**
  **Франтавіка-таварыша за дрот.**

  *Мікола Аўрамчык*

- **Калі сябры прыселі на траве,**
  **Дваім здавалася, што зараз трэці,**
  **Адчуўшы волю, раптам ажыве.**

  *Мікола Аўрамчык*

- **Калі сябры прыселі на траве,**
  **Дваім здавалася, што зараз трэці,**
  **Адчуўшы волю, раптам ажыве.**

  *Мікола Аўрамчык*

- **За край мой, <u>*заліты нявінннай крывёй*</u>,**
  **Праклянцце чужынцам ліхім.**

  *Аляксей Коршак*

- З агульнай колькасці 9200 беларускіх сёл і вёсак, *разбураных і спаленых гітлераўцамі за гады Вялікай Айчыннай вайны*, 4885 было знішчана карнікамі. Поўнасцю, з усімі жыхарамі, было знішчана 627.

*А.Адамовіч, Я.Брыль, У.Калеснік*

- Былі яны проста дзяўчатамі,

Што там ні гавары.
Пужаліся свісту міны,
Чужых незычлівых вачэй,
А гінулі – як мужчыны,
Абняўшы зямлю ямчэй.

*Еўдакія Лось*

- Якія сказы засталіся нявыпісанымі? Чаму?
- Якія адасобленыя члены ёсць у гэтых сказах?
- Якія ўмовы адасаблення? (**Відэапрэзентацыя**).

# МЭТА:

- Садзейнічаць засваенню вучнямі сінтаксічных прымет сказаў з адасобленымі членамі; садзейнічаць выпрацоўцы навыкаў вызначаць адасобленыя члены ў сказах, правільна інтанаваць такія сказы, растаўляць знакі прыпынку пры адасобленых членах сказа;
- Спрыяць развіццю творчай актыўнасці і ініцыятывы вучняў, звязнага маўлення, удасканальваць навыкі работы з камп’ютарам;
- Стварыць умовы для выхавання патрыятызму, дапамагчы ў набыцці ўмення рабіць выбар, ставіць мэту і вырашаць праблему.

# ВЫКАНАННЕ ПРАКТЫЧНЫХ ЗАДАННЯЎ

- 1група і 2 група. **Праца за камп'ютарам: выкананне тэста па тэме "Адасобленыя члены сказа".**

**3група**

***Прачытайце тэкст, правільна інтануючы адасобленыя акалічнасці. Выпішыце з тэксту сказы з адасобленымі акалічнасцямі, запішыце,чым яны выражаны.***

Сюжэты карцін М. Савіцкага выкрываюць злачынствы фашыстаў, адлюстроўваючы жахі фашысцкіх канцлагенраў. З працоўных лагераў пастаянна арганізоўваліся ўцёкі. Звычайна яны правакаваліся здраднікамі ці самімі эсэсаўцамі і былі падставай для знішчэння соцень людзей. Аднак, ведаючы гэта, вязні ўсё роўна спрабавалі ўцячы, спадзеючыся, што хто-небудзь уратуецца і раскажа свету пра іх долю… На карціне “Уцёкі” людзі караскаюцца па дошках, перакінутых праз дрот. Хтосьці падае, знішчаны перакрыжаванымі чэргамі з вышак. Успышка пражэктара, асвяціўшы піраміду цел, гасне, як сама ілюзія ўратавання.

*І.Згруздо*

- Якія пачуцці выклікае карціна?
- Як вы думаеце, чаму М,Савіцкі большую частку сваёй творчасці прысвяціў Вялікай Айчыннай вайне?

# 4 ГРУПА.
# *ПРАЧЫТАЙЦЕ ТЭКСТ. ВЫПІШЫЦЕ СКАЗЫ З АДАСОБЛЕНЫМІ АКАЛІЧНАСЦЯМІ, РАССТАЎЦЕ ЗНАКІ ПРЫПЫНКУ.*

У верасні 1940 года вясковы юнак Міша Савіцкі толькі-толькі закончыўшы дзесяцігодку марыў пра паступленне ў мастацкі інстытут. Але атрымаўшы павестку стаў салдатам.

Калі ішла вайна, М.Савіцкаму было дваццаць гадоў. Трапіўшы ў палон ён зведаў жахі фашысцкіх канцлагераў. Чатыры разы ўцякаў. І чатыры разы – няўдала. Кожны раз злавіўшы збівалі ўцекача да паўсмерці. У фашысцкім канцлагеры ён не спыняў барацьбы арганізоўваючы іншых на супраціўленне фашыстам на дыверсіі на заводзе, дзе іх прымушалі працаваць.

*М.Лісун*

# ЭПІГРАФ:

**Людзі добрыя, помніце: мы любілі жыццё,**
**І Радзіму, і вас, дарагія.**
**Мы згарэлі жывымі ў агні.**
**Наша просьба да ўсіх: хай жалоба і смутак**
**абернуцца ў мужнасць і сілу,**
**каб змаглі ўвекавечыць вы мір**
**І спакой на зямлі…**

*Н. Гілевіч*

# ПЕРАБУДУЙЦЕ СКАЗЫ, КАБ З'ЯВІЛІСЯ АДАСОБЛЕНЫЯ ЧЛЕНЫ СКАЗА

22 чэрвеня 1941 года фашысты парушылі дзяржаўную граніцу і вераломна напалі на нашу краіну. Пачалася Вялікая Айчынная вайна, якая страшэннай віхурай пранеслася па нашай зямлі, разбурыла і знішчыла ўсё, што з вялікай любоўю будаваў народ. Буларусы ўзняліся на барацьбу супраць гітлераўскіх захопнікаў і змагаліся за свабоду і незалежнасць сваёй Радзімы.

**22 чэрвеня 1941 года фашысты, парушыўшы дзяржаўную граніцу, вераломна напалі на нашу краіну. Пачалася Вялікая Айчынная вайна, якая страшэннай віхурай пранеслася па нашай зямлі, разбураючы і знішчаючы ўсё, што з вялікай любоўю будаваў народ. Буларусы, узняўшыся на барацьбу супраць гітлераўскіх захопнікаў, змагаліся за свабоду і незалежнасць сваёй Радзімы.**

- Як новая рэдакцыя ўплывае на сэнс і эмацыянальнае ўздзеянне тэксту?

**VII. Дамашняе заданне**

Напісаць сачыненне-разважанне "Чаму нельга забываць падзеі Вялікай Айчыннай вайны?", выкарыстоўваючы адасобленыя члены сказа. Адасобленыя члены сказа падкрэсліце.